Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна г.Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска”
Аддзел мастацкага выхавання

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад дырэктара
ДУА “Цэнтр дадатковай адукацыі
дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска”
_______________ 2024 г.
№ ______

**Праграма фальклорнага ансамбля**
**“Млынок”**
(мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны
“Музычная творчасць”, накірунак “Фальклорная творчасць”)

Распрацоўшчык:
Мардань Дар’я Анатольеўна,
педагог дадатковай адукацыі

Узрост навучэнцаў: 9-14 гадоў
Тэрмін рэалізацыі: 3 гады

Мінск, 2024

## Агульныя палажэнні

Захаванне і адраджэнне народных традыцый, нацыянальнай самабытнасці беларускага народа – важны аспект выхавання духоўна-маральнай асобы. Трэба ўсвядоміць: чым больш будзе нацыянальнага ў выхаванні, тым мацнейшым стане духоўнае багацце нацыі.

Выхаваць сапраўднага грамадзяніна і патрыёта нельга без апоры на народную творчасць. Фальклор markedly разнабакова ўздзейнічае на дзяцей і падлеткаў: з аднаго боку, дазваляе ажыццяўляць грамадзянскае выхаванне, фарміруе павагу да вынікаў дзейнасці многіх пакаленняў і садзейнічае зараджэнню пачуцця дачынення да гісторыі і культуры свайго народа; з іншага боку, дазваляе эфектыўна развіваць творчыя ўменні і навыкі, вобразнае мысленне, здольнасць да глыбокіх перажыванняў, вучыць творча прымяняць атрыманы вопыт у нестандартных сітуацыях. Адным з лепшых сродкаў развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў з’яўляецца праца з музычным фальклорным матэрыялам.

Праграма фальклорнага ансамбля “Млынок” арыентавана на знаёмства дзяцей і падлеткаў з вуснай народнай творчасцю, навучанне народным аўтэнтычным спевам. Неабходнасць распрацоўкі дадзенай праграмы абумоўлена сучаснымі грамадскімі рэаліямі. Аўтэнтычная манера выканання песень атрымала статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, таму вельмі важна працягваць традыцыі і перадаваць свае веды моладзі праз сацыяльнае праектаванне і рэтрансляцыю народнай спадчыны.

Адметнай рысай праграмы з’яўляецца паслядоўнае вывучэнне беларускай народнай творчасці. На першым годзе навучання прадугледжана знаёмства з міфалогіяй Беларусі, этапамі яе развіцця і даследавання. Навучэнцы вывучаюць міфы, легенды і паданні беларусаў, прасочваюць сувязь вуснай народнай творчасці з творчасцю беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, знаёмяцца з сістэмай міфалагічных персанажаў, развучваюць народныя песні і гульні, у якіх прысутнічаюць міфалагічныя істоты. На другім годзе навучання акцэнт робіцца на каляндарна-абрадавай дзейнасці беларусаў. Дзеці навучаюцца асновам вакальна-ансамблевага майстэрства і асвойваюць спевы беларускага абрадавага календара. Вялікае значэнне адводзіцца этапам правядзення беларускіх святаў і абрадаў, сінкрэтычнаму ўспрыманню фальклору (спевы, рухі, драматургія абраду, музычнае суправаджэнне). Навучэнцы працуюць над стварэннем карты абрадавых дзеянняў, што дазваляе дэтальна засвоіць этапы беларускіх абрадаў і святаў і азнаёміцца з іх рэжысурай. На трэцім годзе навучання асаблівая ўвага надаецца асваенню аўтэнтычнай манеры выканання песень шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Такім чынам, рэалізацыя праграмы садзейнічае ўсебаковаму развіццю навучэнцаў, што, безумоўна, станоўча ўплывае на іх прафесійнае самавызначэнне і можа спатрэбіцца ў любой творчай сферы дзейнасці.

Актуальнасць праграмы фальклорнага ансамбля “Млынок” абумоўлена тым, што на сучасным этапе развіцця культуры вывучэнне народнай творчасці набывае новую і надзвычай адказную ролю. Фальклор, яго віды, жанры, сродкі найбольш поўна раскрываюць карціну народнага жыцця, і адраджэнне народных звычаяў, абрадаў і святаў, навучанне народным аўтэнтычным спевам дазваляе

перадаць маладому пакаленню традыцыйныя маральныя асновы, сфарміраваць патрыятычныя перакананні. Такім чынам, усталёўваецца мост паміж свядомасцю народа, народнай мудрасцю і сучасным грамадствам (спачатку ў навучэнцаў, якія навучаюцца аўтэнтычным спевам у гуртку, а затым і ў больш шырокай аўдыторыі). Акрамя гэтага, засваенне зместу праграмы спрыяе развіццю эмацыянальна-пачуццёвай сферы дзяцей і падлеткаў, іх эстэтычнага стаўлення да наваколля. Падчас працы над вобразамі песень і персанажамі абрадаў адбываецца развіццё творчага мыслення і фантазіі навучэнцаў. Усё гэта садзейнічае фарміраванню сучасных навыкаў “soft skills“ (гнуткія навыкі) – кааперацыі, камунікацыі, крэатыўнасці, эмпатыі, крытычнага мыслення, эмацыйнага інтэлекту, праактыўнасці.

Навізна дадзенай праграмы заключаецца ў тым, што яе змест пашыраны за кошт уключэння розных відаў творчай дзейнасці навучэнцаў (спевы, харэаграфія, інсцэніроўка, музыцыраванне, гульня). Засваенне зместу праграмы адбываецца ў непасрэднай узаемасувязі з рознымі відамі народнай творчасці, этнаграфіяй і міфалогіяй, што спрыяе ахове, зберажэнню і трансляцыі каштоўнасцей традыцыйнай беларускай культуры.

Праграма дапаўняе і пашырае вывучэнне такіх прадметаў агульнаадукацыйнага курса, як “Гісторыя Беларусі”, “Беларуская літаратура”, “Беларуская мова”, “Музыка”, “Мастацтва”.

На занятках ансамбля ствараюцца перадумовы для фарміравання даследчых уменняў і навыкаў навучэнцаў, апасродкавана разглядаюцца перспектывы іх прафесійнага самавызначэння. Вялікая ўвага надаецца сацыяльнаму праектаванню і рэтрансляцыі беларускіх народных традыцый.

Праграма фальклорнага ансамбля “Млынок” распрацавана ў адпаведнасці з тыпавой праграмай дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі мастацкага профілю, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.10.2023 № 325.

Мэта: фарміраванне духоўна-маральных якасцей асобы навучэнцаў і развіццё іх творчых здольнасцей сродкамі музычнага фальклору.

Задачы

навучальныя:

пазнаёміць з народнай культурай і фальклорнымі традыцыямі беларусаў;

даць веды пра слыхавыя і вакальна-ансамблевыя навыкі (інтанацыя, рытм, пеўчае дыханне, дыкцыя, гукавядзенне і інш.);

далучаць дзяцей і падлеткаў да аўтэнтычных форм народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

развіццёвыя:

развіваць музычна-творчыя здольнасці навучэнцаў;

пашыраць эмацыянальна-вобразны свет дзяцей сродкамі каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай музыкі;

фарміраваць даследчыя ўменні і навыкі;

садзейнічаць гарманізацыі асобы навучэнцаў шляхам далучэння да беларускага этнамузычнага мастацтва;

выхаваўчыя:

фарміраваць духоўна-маральныя якасці асобы, выхоўваць пачуццё патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны;

фарміраваць каштоўнасныя арыенціры ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай культуры свайго народа ў сістэме культуры чалавецтва;

выхоўваць эстэтычны і мастацкі густ;

садзейнічаць сацыяльнай адаптацыі і прафесійнаму самавызначэнню навучэнцаў.

Праграма пабудавана на наступных педагагічных прынцыпах:

агульнадыдактычныя прынцыпы: нагляднасці, даступнасці, сістэмнасці і паслядоўнасці, свядомасці і актыўнасці, сувязі тэорыі з практыкай, навуковасці;

прынцыпы выхавання: мэтанакіраванасці выхаваўчага працэсу, адпаведнасці выхавання ўзроставым і індывідуальным асаблівасцям навучэнцаў, выхаванне асобы ў калектыве, узаемадзеяння сямейнага і грамадскага выхавання.

Праграмай прадугледжаны наступныя арганізацыйныя формы педагагічнага ўзаемадзеяння: калектыўная, групавая, індывідуальная. Калектыўная і групавая формы садзейнічаюць фарміраванню калектыўных уменняў, выхаванню пачуцця калектывізму.

Пры рэалізацыі праграмы фальклорнага ансамбля “Млынок” выкарыстоўваюцца формы і метады навучання і выхавання, накіраваныя на дасягненне чакаемых вынікаў засваення праграмы.

Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу з’яўляецца занятак. Вучэбны матэрыял падаецца даступна, з улікам узроставых і індывідуальных асаблівасцей навучэнцаў. Змест праграмы ўключае як тэарэтычныя, так і практычныя заняткі. Перавага аддаецца практычным заняткам, бо праграма мае практыкаарыентаваную накіраванасць і большая частка тэарэтычнага матэрыялу падаецца ў працэсе практычнай дзейнасці.

Праграмай прадугледжаны як традыцыйныя формы правядзення заняткаў (лекцыя, гутарка, практыкум, камбінаваны тэматычны занятак і інш.), так і нетрадыцыйныя (занятак-гульня, інсцэніроўка, віртуальная экскурсія, даследаванне-практыкум, прадстаўленне творчых праектаў, свята і інш.).

На тэарэтычных занятках удзельнікі ансамбля знаёмяцца з асноўнымі жанрамі беларускай народнай творчасці, вывучаюць каляндарна-абрадавыя і пазаабрадавыя традыцыі беларусаў, асаблівасці нацыянальнага касцюма, даведваюцца пра спецыфіку правядзення фальклорнай экспедыцыі. Вялікае значэнне педагог надае знаёмству з фальклорнымі калектывамі Беларусі, з рэканструкцыямі традыцыйных рэгіянальных свят і абрадаў. Гэта стварае перадумовы да абуджэння патрыятычных пачуццяў у навучэнцаў, спрыяе глыбокаму разуменню асноў нацыянальнай культуры, фарміруе грамадзянскую ідэнтычнасць.

У працэсе практычнага засваення зместу праграмы навучэнцы вывучаюць беларускія народныя песні, танцы, гульні, абрады; авалодваюць вакальна-тэхнічнымі і вакальна-ансамблевымі навыкамі; навучаюцца асновам народных спеваў і асвойваюць манеру выканання песень розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Гэтыя заняткі не толькі развіваюць творчыя здольнасці навучэнцаў,

фарміруюць іх эстэтычны густ, але і ажыццяўляюць псіхалагічную і практычную падрыхтоўку да выбару прафесіі.

Праца па вывучэнні песеннага фальклору ўключае ў сябе некалькі этапаў. Спачатку адбываецца вуснае азнаямленне з музычным творам. Далей навучэнцы слухаюць народную песню ў выкананні педагога або праслухоўваюць запісы з аўтэнтычнымі ўзорамі беларускай народнай песеннай культуры. Ідзе расшыфроўка тэксту з выдзяленнем дыялектных слоў, асаблівасцей гучання, стылістычных асаблівасцей, пасля чаго практыкуюцца спевы з педагогам і самастойнае выкананне песень удзельнікамі ансамбля.

Асаблівае месца ў адукацыйным працэсе адводзіцца рэпетыцыйным заняткам, калі ўсе ўдзельнікі ансамбля збіраюцца разам. Найбольш карысная такая форма работы для дзяцей, якія толькі пачынаюць асвойваць пеўчую этнафонію: яны ўважліва слухаюць старэйшых і стараюцца ім падпяваць. Гэта садзейнічае больш хуткаму і паспяховаму засваенню зместу праграмы.

Важны накірунак работы ансамбля – удзел навучэнцаў у народных святах. Такая дзейнасць спрыяе якаснаму авалоданню традыцыйнымі спевамі: падчас святочнага абраду песня выконваецца ў сувязі з яе непасрэдным прызначэннем, таму працэс выканання музычнага твора адбываецца гарманічна і навучэнцы маюць магчымасць адчуць свабоду ў спевах.

Асаблівая ўвага надаецца выхаваўчай рабоце. Яна праводзіцца на кожным занятку ансамбля і грунтуецца на этнапедагогіцы. Асноўныя накірункі выхаваўчай дзейнасці – фарміраванне эстэтычных, духоўна-маральных, валявых якасцей асобы навучэнцаў, фарміраванне і развіццё калектыву. Вялікае выхаваўчае значэнне маюць навыкі працы з архіўнымі запісамі (для прафесійнага і аналітычнага ўспрымання фальклорных матэрыялаў), наведванне майстар-класаў фальклорных ансамбляў з удзелам носьбітаў культуры, экскурсіі, бо выхаванне глядацкай культуры фарміруе ўстойлівую цікавасць да захавання і трансляцыі мастацкай народнай культуры.

Адукацыйны працэс у фальклорным ансамблі “Млынок” – гэта творчае прадуктыўнае ўзаемадзеянне ўсіх яго ўдзельнікаў (педагога і навучэнцаў, навучэнцаў як партнёраў на сцэнічнай пляцоўцы). Рэалізацыя праграмы дазваляе максімальна раскрыць творчыя здольнасці навучэнцаў і ўзбагаціць іх асобу. Асноўным індыкатарам паспяховасці засваення праграмнага матэрыялу навучэнцамі з’яўляюцца інсцэніроўкі абарадвых песень, пастаноўкі беларускіх народных абрадаў, правядзенне канцэртных праграм і майстар-класаў у дзяржаўных установах адукацыі і культуры, удзел у раённых і гарадскіх мерапрыемствах, адкрытыя выніковыя заняткі.

Праграмай прадугледжаны наступныя формы падвядзення вынікаў яе рэалізацыі:

першы год навучання – музычна-тэатральная пастаноўка “Па старонках беларускіх міфаў”;

другі год навучання – канцэртная праграма “Фальклор на ўзроўні душы”;

трэці год навучання – фальклорнае свята “Карагод традыцый”.

У рамках адукацыйнага працэсу ажыццяўляецца маніторынг асобаснага развіцця навучэнцаў шляхам назірання і аналізу іх працы падчас заняткаў, у

працэсе падрыхтоўкі і ўдзелу ў мерапрыемствах. Вынікі назіранняў фіксуюцца педагогам і дазваляюць прасачыць рост кожнага навучэнца за ўвесь перыяд навучання. Формамі фіксацыі вынікаў рэалізацыі праграмы ансамбля “Млынок” з’яўляюцца фота- і відэатэка, афармленне этнафанічных аналізаў абрадавых песень і карт абрадавых дзеянняў, партфоліа калектыву.

Для дасягнення пастаўленай мэты і рэалізацыі задач праграмы выкарыстоўваюцца наступныя метады навучання:

славесныя метады (тлумачэнне, апавяданне, дыялог, гутарка, абмеркаванне);

практычныя метады (практыкаванні, развучванне песень і танцаў, гульні, пастаноўкі абрадаў, інсцэніроўкі, творчыя заданні, рэпетыцыі, экскурсіі, майстар-класы і інш.);

наглядны метад (прагляд відэаматэрыялаў, дэманстрацыя ілюстрацый, здымкаў, прэзентацый).

Спецыфіка праграмы прадугледжвае выкарыстанне на занятках метаду фальклорнай арт-тэрапіі (фольк-тэрапіі), які на сучасным этапе набывае асаблівую сацыяльную значнасць у педагогіцы. Найбольш актуальны гэты метад на першым годзе навучання: ён дазваляе спрасціць працэс сацыялізацыі і адаптацыі ў новым калектыве.

Фальклор дэманструе адзінства музыкі, вакалу, танца, драмы, таму з’яўляецца ідэальнай платформай для развіцця ўсіх органаў пачуццяў, а таксама базай для фарміравання культурна-эстэтычнага ўспрымання як свайго народа, так і іншых нацыянальнасцей.

Фальклор забяспечвае здаровае ўзаемадзеянне чалавека з навакольным светам, людзьмі і самім сабой. Тэрапеўтычнае ўздзеянне традыцыйнага песеннага фальклору накіравана на развіццё навыкаў камунікацыі, на карэкцыю непажаданых рыс асобы, на пазбаўленне ад негатыўных эмоцый. Падчас спеваў навучэнцы пераадольваюць псіхалагічны заціск, у выніку чаго атрымоўваецца вольны, гучны голас, паляпшаюцца дыкцыя, артыкуляцыя. Аўтэнтычнаму выкананню характэрны асаблівы гукавы скід у канцы музычнай фразы, доўгія (цэлыя) па гучанні ноты, што спрые дадатковай эмацыйнай разрадцы. Народныя танцы і гульні дазваляюць палепшыць фізічны і псіхалагічны стан навучэнцаў, бо арганічна аб’ядноўваюць у сабе музыку, рух, словы, а таксама імправізацыю саміх дзяцей. Пры развучванні пабытавых танцаў навучэнцы свой настрой і эмоцыі накіроўваюць у рухі рук і ног (асаблівасць беларускіх народных танцаў – прытупы), што спрыяе ўсталяванню эмацыйнага камфорту. Дзеці вучацца спалучаць свае паводзіны з паводзінамі іншых, імітаваць працоўную дзейнасць (“А мы проса сеялі”, “Жораў”). Пры выкарыстанні музычных народных інструментаў (у асноўным ударных) у навучэнцаў фарміруецца пачуццё рытму, развіваюцца музычны слых і дробная маторыка.

Выкананне твораў у народнай пеўчай манеры патрабуе ад навучэнцаў асаблівых ведаў і ўменняў. Важна навучыць дзяцей не толькі чуць свой голас і кіраваць ім, але і слухаць спеў педагога і іншых удзельнікаў ансамбля. Таму на занятках, асабліва на пачатку навучання, шырока выкарыстоўваецца метад пераймання. Эфектыўным з’яўляецца і праслухоўванне аўдыязапісаў народных

песень у выкананні носьбітаў традыцый. Гэтыя метады дапамагаюць больш поўна і дакладна адчуць меладычную прыроду беларускай песні, захаваць тэмбральна-акустычныя асаблівасці яе гучання, што, у сваю чаргу, вядзе да лепшага засваення ансамблевага рэпертуару.

Праявіць самастойнасць, актыўнасць, адказнасць, творча падысці да вырашэння пастаўленай задачы навучэнцам дазваляюць праблемны, пошукава-даследчы метады (праца з архіўнымі запісамі, складанне карты абрадавых дзеянняў, складанне карты народных строяў).

У адукацыйным працэсе педагогам шырока прымяняюцца спецыфічныя метады:

метад тэхнічна апасродкаванага назірання (праслухоўванне аўтэнтычных песенных узораў з дапамогай тэхнічных сродкаў);

аналітычны метад (этнафанічны аналіз);

імітацыйна-імправізацыйны метад (дакладная інтэрпрэтацыя гучання этнафанічнага ўзору);

фанетычна-канцэнтрычны метад (паслядоўная інтэнсіўнасць тэсітуры выканання і тэмбравай палітры).

Развіццю самарэгуляцыі, самаацэнкі і самакантролю навучэнцаў, іх пазнавальнай матывацыі спрыяюць рэфлексіўныя метады (запаўненне экранаў настрою, рэфлексіўныя тэхналогіі “Камплімент”, “Слова-імпульс”, “Дапішы фразу”, “Святлафор”, “Рэфлексійны круг” і інш.).

Важным стымулам асобаснага развіцця і самарэалізацыі навучэнцаў з’яўляецца стварэнне сітуацыі поспеху, станоўчая ацэнка іх дзейнасці. З гэтай мэтай выкарыстоўваюцца наступныя метады выхавання:

метады стымулявання і матывацыі дзейнасці (педагагічная ацэнка, заахвочванне);

метад станоўчага прыкладу;

метад пераканання.

У пачатку працэсу навучання педагогам праводзіцца пачатковая дыягностыка мастацкіх уменняў і навыкаў, вакальных здольнасцей навучэнцаў (праслухоўванне), выяўленне цікавасці да народнай культуры, схільнасцей і запатрабаванняў выхаванцаў (анкетаванне, апытанне). Для адсочвання дынамікі развіцця асобы навучэнцаў на пачатак кожнага навучальнага года ажыццяўляецца паўторная дыягностыка.

Праграмай прадугледжаны наступныя віды кантролю: бягучы, прамежкавы і выніковы. Бягучы кантроль ажыццяўляецца сродкамі педагагічнага назірання, гутаркі, апытання, выканання тэматычных заданняў, аналізу ўдзелаў у канцэртных праграмах. Прамежкавы кантроль (засваенне тэарэтычных ведаў, авалоданне практычнымі ўменнямі і навыкамі) праводзіцца пасля праходжання асноўных раздзелаў праграмы ў форме творчых выступленняў. Выніковы кантроль ведаў, уменняў і навыкаў навучэнцаў ажыццяўляецца ў канцы кожнага навучальнага года ў форме музычна-тэатральнай пастаноўкі, канцэртнай праграмы, фальклорнага свята. Выніковыя мерапрыемствы дазваляюць не толькі сістэматызаваць атрыманыя веды, прадэманстраваць свае ўменні, але і прымяніць сфарміраваныя навыкі ў

практычнай дзейнасці. Пасля мерапрыемства праводзіцца комплексная рэфлексія, дзе сумесна з навучэнцамі ацэньваюцца вынікі работы на працягу навучальнага года.

На занятках выкарыстоўваюцца здароўезберагальныя тэхналогіі:

індывідуалізацыя навучання;

размеркаванне інтэнсіўнасці нагрузкі на працягу заняткаў;

чаргаванне розных відаў дзейнасці;

дыхальныя практыкаванні і артыкуляцыйная гімнастыка;

фізкультхвілінкі;

стварэнне здароўезберагальнай прасторы ў кабінеце.

Пры рэалізацыі праграмы выкарыстоўваюцца наступныя сродкі навучання: схемы, малюнкі, ілюстрацыі, прэзентацыі, кнігі, часопісы, відэаматэрыялы, аўдыяматэрыялы і г.д. Шырока выкарыстоўваюцца сродкі мастацтва (літаратуры, музыкі, тэатра, выяўленчага мастацтва, кіно, радыё і тэлебачання).

Для больш эфектыўнага правядзення заняткаў у адукацыйным працэсе актыўна прымяняюцца сучасныя тэхналогіі і лічбавыя сродкі навучання: Інтэрнэт-рэсурсы, навучальныя платформы і сэрвісы (Google сэрвісы: Google Прэзентацыі, Google Формы), прагляд запісаў з фальклорных экспедыцый, рэпартажы з удзелам носьбітаў традыцый, мультымедыйныя прэзентацыі, відэа- і аўдыяматэрыялы.

Дадзеная праграма прызначана для навучэнцаў ва ўзросце ад 9 да 14 гадоў.

Змест праграмы прадугледжвае 3 гады навучання. Групы фарміруюцца па ўзроставых катэгорыях.

Першы год навучання. Узрост навучэнцаў – 9-12 гадоў. Заняткі праводзяцца 2 разы на тыдзень па 2 вучэбныя гадзіны. Агульная колькасць вучэбных гадзін на год – 144 вучэбныя гадзіны. Напаўняльнасць групы – не менш за 12 чалавек.

Другі год навучання. Узрост навучэнцаў – 10-13 гадоў. Заняткі праводзяцца 3 разы на тыдзень па 2 вучэбныя гадзіны. Агульная колькасць вучэбных гадзін на год – 216 вучэбных гадзін. Напаўняльнасць групы – не менш за 8 чалавек.

Трэці год навучання. Узрост навучэнцаў – 11-14 гадоў. Заняткі праводзяцца 3 разы на тыдзень па 2 вучэбныя гадзіны. Агульная колькасць вучэбных гадзін на год – 216 вучэбных гадзін. Напаўняльнасць групы – не менш за 8 чалавек.

Форма атрымання дадатковай адукацыі – вочная.

Форма правядзення заняткаў – групавая.

Заняткі праводзяцца ў кабінеце, які адпавядае спецыфічным санітарна-гігіенічным патрабаванням (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 07.08.2019 № 525), патрабаванням бяспечнага знаходжання навучэнцаў, правілам пажарнай бяспекі.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне: ноўтбук; сінтэзатар; аўдыя- і відэаапаратура; радыёапаратура; калонка; мікрафон; гукаўзнаўляючая апаратура; народныя музычныя інструменты (трашчотка, бубен, акарына).

Інфармацыйна-метадычнае забеспячэнне: відэаагляды народных святаў і абрадаў (“Як гучыць Любаншчына”, “Беларускі карнавал: Каляды”), CD-дыскі з экспедыцыйнымі запісамі, відэазапісы з фальклорных экспедыцый, відэазапісы рэгіянальных святаў і абрадаў, мультымедыйныя прэзентацыі (“Народныя святы і абрады”,“Беларускі народны касцюм”), этнафанічныя аналізы абрадавых песень, карты абрадавых дзеянняў.

Кадравае забеспячэнне: акампаніятар, пры неабходнасці – кансультацыі харэографа.

## Першы год навучання

Задачы:

пазнаёміць з асноўнымі жанрамі беларускага фальклору;

знаёміць з беларускай міфалогіяй, сістэмай яе персанажаў;

навучаць вакальна-тэхнічным і вакальна-ансамблевым навыкам;

знаёміць з асновамі народнай музыкі;

навучаць беларускім народным спевам і гульням.

### Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць вучэбных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго гадзін | у тым ліку | |
| | | | тэарэтычных | практычных |
| | Уводны занятак | 2 | 1 | 1 |
| 1. | Беларуская народная творчасць | 8 | 4 | 4 |
| 2. | Вакальна-ансамблевая работа | 32 | 10 | 22 |
| 3. | Міфалогія як частка нацыянальнай культуры | 20 | 7 | 13 |
| 3.1 | Міфы і паданні | 6 | 2 | 4 |
| 3.2 | Асаблівасці міфалагічнага мыслення беларусаў | 14 | 5 | 9 |
| 4. | Сістэма персанажаў беларускай міфалогіі | 44 | 10 | 34 |
| 4.1 | Духі хатніх і гаспадарчых пабудоў | 8 | 4 | 4 |
| 4.2 | Духі прыроднай прасторы | 12 | 6 | 6 |
| 4.3 | Міфалагічныя персанажы ў беларускіх песнях і гульнях | 24 | - | 24 |
| 5. | Слуханне музыкі | 6 | 1 | 5 |
| 6. | Пастаноўчая работа | 16 | - | 16 |
| 7. | Канцэртная дзейнасць | 6 | - | 6 |
| 8. | Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць | 8 | 1 | 7 |
| | Выніковы занятак | 2 | - | 2 |
| | Усяго | 144 | 34 | 110 |

## Змест праграмы

Уводны занятак

Знаёмства з навучэнцамі. Азнаямленне са зместам праграмы і планам работы ансамбля, рэжымам правядзення заняткаў. Падбор рэпертуару. Правілы бяспечных паводзін на занятках.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне, дыягностыка музычных здольнасцей навучэнцаў.

1. Беларуская народная творчасць

Паняцце “фальклор”. Жанры беларускага фальклору. Каляндарна-абрадавы, сямейна-абрадавы і пазаабрадавы фальклор беларусаў. Музычны фальклор, яго віды і жанры. Беларускія народныя інструменты (бубен, трашчотка, званочкі, ражок, бразготка, вугольнік, акарына і інш.), асаблівасці іх гучання.

Практычныя заняткі.

Прагляд тэматычных відэаматэрыялаў. Праслухоўванне аўдыязапісаў музычных твораў розных жанраў, вызначэнне іх асаблівасцей (характар, дыялектныя асаблівасці, манера выканання і інш.). Дэманстрацыя педагогам мастацкіх магчымасцей інструментаў. Практычнае азнаямленне з прыёмамі ігры на беларускіх народных музычных інструментах.

2. Вакальна-ансамблевая работа

Будова галасавога апарата. Гігіена голасу, падрыхтоўка галасавога апарата да работы. Пеўчае дыханне. Паняцце “пеўчая ўстаноўка”. Паняцце “рэзанатар”. Паняцці “лад”, “рэгістр”, “гукарад”. Прыёмы гукавядзення. Атака гуку. Правільнае становішча корпуса, шыі, галавы падчас спеваў. Тэмп. Дынаміка. Унісон. Асаблівасці народнага гукаўтварэння (спосабы гукаўтварэння, фарміраванне галосных). Тэрапеўтычнае ўздзеянне традыцыйнага песеннага фальклору: пераадольванне псіхалагічнага заціску, пазбаўленне ад негатыўных эмоцый.

Практычныя заняткі.

Практыкаванні для выпрацоўкі навыкаў пеўчага дыхання. Праца над фарміраваннем працяглага і плаўнага выдыху. Спеў у становішчы седзячы і стоячы. Адпрацоўка навыка спеваў ва ўнісон. Праслухоўванне песеннага рэпертуару. Разбор сродкаў музычнай выразнасці (лад, гармонія, тэмп, рытм, дынамічныя адценні). Гукавы скід у музычнай фразе. Развучванне і выкананне рэпертуарных твораў без суправаджэння і ў суправаджэнні музычных інструментаў.

3. Міфалогія як частка нацыянальнай культуры

3.1 Міфы і паданні

Міфалогія як сістэма ўяўленняў і спосаб разумення свету. Значэнне і змест паняццяў “міф”, “паданне”, “легенда”. Віды міфаў (татэмічныя, астральныя, гераічныя і інш.). Фарміраванне славянскай міфалогіі. Прапантэон і пантэон.

Практычныя заняткі.

Азнаямленне з тэкстамі беларускіх міфаў, легенд і паданняў. Прадстаўленне адной легенды, міфа ці падання ў творчай форме (на выбар навучэнцаў).

### 3.2 Асаблівасці міфалагічнага мыслення беларусаў

Міфалогія беларусаў: агульная характарыстыка, спецыфічныя рысы. Вядомыя даследчыкі беларускага фальклору (А.Кіркор, П.Шпілеўскі, А.Е.Раманаў, М.Шэйн, П.Шэйн і інш.). Міфічныя ўяўленні першага тысячагоддзя нашай эры. Часава-прасторавыя, сацыяльныя, ацэначныя характарыстыкі свету. Увасабленне беларускай міфалогіі ў народнай музычнай культуры. Дзіцячы фальклор (папеўкі з беларускіх народных гульняў). Міфалагічныя персанажы ў творах беларускіх паэтаў і пісьменнікаў (Уладзімір Караткевіч, Адам Міцкевіч, Янка Купала, Якуб Колас, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Максім Багдановіч, Ян Чачот, Ян Баршчэўскі, Максім Гарэцкі). Песні і музычныя творы на літаратурныя сюжэты.

Практычныя заняткі.

Знаёмства з урыўкамі з апавядання Я.Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”, баладай А.Міцкевіча “Рыбка”, вершамі М.Багдановіча “Чуеш гул?...”, “Срэбныя змеі”, “Возера”. Развучванне музычных твораў дзіцячага фальклору (“Як пайшоў казёл”, “Сядзіць Яшчур”). Знаёмства з песнямі і гульнямі, у якіх прысутнічаюць персанажы беларускай міфалогіі. Распрацоўка на іх аснове сваіх гульняў. Інструментальнае суправаджэнне песень і гульняў.

## 4. Сістэма персанажаў беларускай міфалогіі

### 4.1 Духі хаты і гаспадарчых пабудоў

Галоўныя духі хаты і гаспадарчых пабудоў у беларускай міфалогіі. Хатнік і Хатніца. Шкадлівыя Духі хаты: Пячурнік, кікімары, Бай, Валасень, шэшкі. Нядобрыя Духі хаты: злыдні, Бадзюля, Сербай. Духі гаспадарчых пабудоў: Вісус, Хлеўнік, Вазіла, Ёўнік, Пуннік, Лазнік. Знешні выгляд, месца бытавання, рысы характару, звычкі духаў.

Практычныя заняткі.

Прагляд ілюстрацый з энцыклапедыі “Міфалогія Беларусі”. Прагляд тэматычных відэаматэрыялаў. Прадстаўленне аднаго з міфалагічных персанажаў у творчай форме (на выбар навучэнцаў).

### 4.2 Духі прыроднай прасторы

Міфалагічныя персанажы палёў і агародаў: Жыцень, Талака, Русалкі-жытніцы, Палявік, Жалезная Баба. Знешні выгляд, рысы характару, звычкі духаў. Духі ляснога гаспадарства: Купальскі Дзядок, Гаспадар лесу, Лясун, Пушчавік, Ягіня, Дабрахочы, Гаёвы Дзед, гаёўкі, Зазоўка, Лойма. Знешні выгляд, рысы характару, звычкі духаў. Духі падземнага гаспадарства: Чарнабог, Вялес, Жыжаль, Ох, Кладнік, Зюзя. Знешні выгляд, рысы характару, звычкі духаў. Духі падводнага гаспадарства: Гаспадар рыб, Жэўжык, Вадзянік, Русалкі-вадзяніцы, Баламуцень, азярніцы, расамахі. Знешні выгляд, рысы характару, звычкі духаў. Духі балотнага гаспадарства. Вобразы Лазавіка, Кадука, Балотніка, Багніка, Аржавенніка, Русалкі-балотніцы. Знешні выгляд, рысы характару, звычкі духаў.

Практычныя заняткі.

Прагляд ілюстрацый з энцыклапедыі “Міфалогія Беларусі”. Прагляд тэматычных відэаматэрыялаў. Прадстаўленне аднаго з міфалагічных персанажаў у творчай форме (на выбар навучэнцаў).

4.3 Міфалагічныя персанажы ў беларускіх песнях і гульнях

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне абрадавага песеннага фальклору, аналіз зместу, кантэкст выканання, гістарычная каштоўнасць тэкстаў. Развучванне мелодый абрадавых песень каляндарнага цыклу з міфалагічнымі персанажамі (“Правяду русалку я да бору”, “Сядзіць Яшчур”, “Шла Купалка па вуліцы”, “Русалачка-купалачка” і інш.). Персаніфікацыя каляндарных святаў (вобраз Купалы, Каляды, Юр’і). Гульні “Яшчур”, “Явар”, “Дзядуля-ражок”. Развучванне слоў гульні “Яшчур”. Злучэнне харэаграфічных рухаў са спевамі.

5. Слуханне музыкі

Беларускі фальклор у запісах.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне твораў беларускай народнай музыкі ў выкананні носьбітаў народнай культуры і прафесійных выканаўцаў.

6. Пастаноўчая работа

Практычныя заняткі.

Рэпетыцыйная дзейнасць. Падрыхтоўка да музычна-тэатральнай пастаноўкі “Па старонках беларускіх міфаў”. Выстройванне ўнісону. Адпрацоўка інтанавання меладычных хадоў. Праца над інтанацыйнымі і дыкцыйнымі складанасцямі ў творы. Праца над мастацкім вобразам песні. Адпрацоўка харэаграфічных рухаў і камбінацый.

7. Канцэртная дзейнасць

Практычныя заняткі.

Удзел у канцэртах, фестывалях і конкурсах. Правядзенне канцэртных праграм, майстар-класаў ва ўстановах адукацыі і культуры (ДУА “Рэспубліканская гімназія-каледж пры акадэміі музыкі”, бібліятэкі горада Мінска, дзяржаўныя музеі і інш.).

8. Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць

Агляд культурных падзей.

Практычныя заняткі.

Наведванне канцэртаў і майстар-класаў.

Выніковы занятак

Музычна-тэатральная пастаноўка “Па старонках беларускіх міфаў” з запрашэннем бацькоў.

**Матэрыял для працы з навучэнцамі першага года навучання**

Прыкладны песенны рэпертуар

Дзіцячы фальклор (“Як пайшоў казёл”, “Сядзіць Яшчур”);

“Правяду русалку я да бору”;

“Шла Купалка па вуліцы”;

“Русалачка-купалачка”;

“Прыйшла Каляда”;

“Го-го-го, каза”;

Народныя гульні

“Яшчур”; “Явар”; “Дзядуля-ражок”.

Відэаматэрыял для працы з навучэнцамі

1. “Древняя мифология леса белорусов. Беларусь на ладошке” (https://www.youtube.com/watch?v=DRZLfSAd7jU).

2. “Духі. Ілюстраваная кніга, заснаваная на павер’ях беларусаў” (https://www.youtube.com/watch?v=Tt1EcMPstN0).

3. “Интересные факты о реальных обитателях белорусского леса”. Детский музей мифологии и леса (https://www.youtube.com/watch?v=cfgCfu9gRwY).

4. “Легенды и сказания Беларуси. Аист”. Семейный канал. Студия “Беларусьфильм” (https://www.youtube.com/watch?v=M0Lkoja-49M).

5. “Легенды і паданні зямлі беларускай: пра возера Нарач” (https://www.youtube.com/watch?v=cOnTZ0FX5L4).

6. “Мифы белорусской земли. Духи болот и земли” (https://www.youtube.com/watch?v=QeeL4zFI8Fw).

7. “Цмок і прыгажуня. Паданне пра Лукомскага цмока: трагічная гісторыя кахання” (https://www.youtube.com/watch?v=vIpy1RDrwXc).

8. “Чароўны свет: з беларускіх міфаў, паданняў і казак” (https://www.youtube.com/watch?v=BXpz6oF7dYw).

9. “Velcom. 1000 музеяў Беларусі. Дзіцячы музей міфалогіі і лесу” (https://ok.ru/video/10013509104)

Літаратурны матэрыял для працы з навучэнцамі

1. “Залатая гара” (Міфалогія беларусаў, ПАШ. Ф. 7, воп. 1, спр. МС – 05/03).

2. “Пярун і Гардзіслава” (Міфалогія беларусаў,ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС – 127/06 ).

3. “Як Жыцень правучыў Няждана” (Міфалогія беларусаў, ПАШ. Ф. 10, воп. 4, спр. МС – 157/06).

4. “Паляўнічы і Лясун” (Міфалогія беларусаў, ПАШ. Ф. 10, воп. 3, спр. МС – 95/06).

5. “Марэна і Стах” (Міфалогія беларусаў, ПАШ. Ф. 10, воп. 5, спр. МС – 161/06).

6. Зборнік Я.Баршчэўскага “Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях”.

7. Балады А.Міцкевіча “Рыбка”, “Люблю я”, “Курганок Марылі”.

8. Вершы М.Багдановіча “Чуеш гул?...”, “Срэбныя змеі”, “Возера”, “Русалка”, “Лясун”, “На возеры”, “Змяіны Цар”.

9. Вершы Я.Купалы “Чорны бог”, “Русалка”, “Ваўкалак”, “У вечным боры…”, “Хохлік”, “Ноч за ночкай”, “У купальскую ноч”.

10. Зборнік Я Коласа “Казкі жыцця”.

11. Вершаваныя аповесці В. Дуніна-Марцінкевіча “Купала”, “Шчароўскія дажынкі”.

12. Аповесць У.Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха”.

## Чакаемыя вынікі засваення праграмы

Пасля заканчэння першага года навучання навучэнцы павінны ведаць:

жанры беларускага фальклору;

асаблівасці беларускай міфалогіі, яе асноўных персанажаў;

сродкі музычнай выразнасці;

характэрныя асаблівасці народнай музыкі;

беларускія народныя песні і гульні з міфалагічнымі персанажамі;

умець:

чыста інтанаваць мелодыю;

спяваць ва ўнісон;

працаваць з мікрафонам;

выконваць беларускія народныя песні з рухамі без суправаджэння і ў суправаджэнні музычнага інструмента;

валодаць:

пеўчым дыханнем;

асноўнымі прыёмамі гукавядзення;

навыкамі сцэнічнай культуры.

## Другі год навучання

Задачы:

знаёміць з каляндарна-абрадавым і пазаабрадавым фальклорам Беларусі;

знаёміць з базавымі элементамі беларускай народнай харэаграфіі;

знаёміць з аўтэнтычнымі формамі народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

фарміраваць асновы вакальна-ансамблевага майстэрства;

навучаць спевам твораў з беларускага абрадавага календара;

навучаць беларускім народным танцам, гульням і абрадам.

### Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзелаў, тэмы | Колькасць вучэбных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго гадзін | у тым ліку | |
| | | | тэарэтычных | практычных |
| | Уводны занятак | 2 | 1 | 1 |
| 1. | Беларуская народная творчасць | 8 | 4 | 4 |
| 2. | Вакальна-ансамблевая работа | 32 | 12 | 20 |
| 3. | Асновы аўтэнтычных спеваў | 16 | 4 | 12 |
| 4. | Беларуская каляндарна-абрадавая традыцыя | 104 | 24 | 80 |
| 4.1 | Восеньскія песні | 26 | 6 | 20 |
| 4.2 | Зімовыя песні | 32 | 6 | 26 |
| 4.3 | Песні веснавога цыклу | 20 | 6 | 14 |
| 4.4 | Песенная традыцыя летняга цыклу | 26 | 6 | 20 |
| 5. | Народная харэаграфія | 14 | 4 | 10 |
| 6. | Пастаноўчая работа | 20 | - | 20 |
| 7. | Канцэртная дзейнасць | 8 | - | 8 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8. | Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць | 10 | 1 | 9 |
| | Выніковы занятак | 2 | - | 2 |
| | Усяго | 216 | 50 | 166 |

## Змест праграмы

### Уводны занятак

Азнаямленне са зместам праграмы і планам работы ансамбля другога года навучання. Падбор рэпертуару. Правілы бяспечных паводзін на занятках. Актуалізацыя ведаў па пройдзеным матэрыяле.

Практычныя заняткі.

Паўторная дыягностыка навучэнцаў: праверка музычных здольнасцей і галасавых дадзеных пасля летніх канікул. Спевы знаёмых вакальных практыкаванняў.

### 1. Беларуская народная творчасць

Беларускі народны каляндар. Народныя святы і абрады. Святочна-абрадавы комплекс: абрадавая дзея, атрыбутыка, музычны фальклор.

Практычныя заняткі.

Прагляд відэазапісаў народных абрадаў. Праслухоўванне і аналіз абрадавага песеннага матэрыялу.

### 2. Вакальна-ансамблевая работа

Дыяфрагмальнае дыханне. Грудны, сярэднеязычны і галаўны рэзанатары. Метрарытм. Вакальна-ансамблевыя навыкі. Дыкцыя і артыкуляцыя. Функцыі артыкуляцыйнага апарата. Уплыў дыкцыі і артыкуляцыі на якасць выканання песеннага матэрыялу.

Практычныя заняткі.

Гімнастыка на дыханне. Адпрацоўка пеўчых навыкаў: дыяфрагмальнае дыханне, чыстае інтанаванне, перадача розных адценняў інтанацыі ў залежнасці ад эмацыйна-сэнсавай афарбоўкі твора, перадача фальклорных інтанацыйных элементаў. Практыкаванні для артыкуляцыйнага апарата. Праца над развіццём выразнай дыкцыі. Прапяванне скорагаворак. Практыкаванні на распрацоўку гуку груднога, сярэднеязычнага і галаўнога рэзанатараў.

### 3. Асновы аўтэнтычных спеваў

Паняцце “аўтэнтычныя спевы”. Манеры выканання ў розных рэгіёнах Беларусі (фанемныя асаблівасці, пазіцыя выканання, атака гуку, рытмічны малюнак). Тэмбральны слых як галоўны фактар выканання спеваў у розных манерах. Паняцце дыялекту. Асаблівасці гаворак Панямоння, Падзвіння, Палесся, іх адлюстраванне ў народных песнях. Выкарыстанне груднога, сярэднеязычнага і галаўнога рэзанатараў у спевах розных рэгіёнаў Беларусі. Асаблівасці выканання абрадавых песень на Панямонні, Палессі, Паазер’і, Падзвінні, у Цэнтральнай Беларусі.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне песень з выразнымі дыялектнымі асаблівасцямі (“Ой, дайтэ мне раду”, “На граной нядзелі русалкі сядзелі”, “Росці, каравай”, “Стара галачка” і інш.). Праслухоўванне і этнафанічны аналіз песень Брэсцкага Палесся

(грудны рэзанатар), Віцебскага Паазер'я (сярэднеязычны, галаўны рэзанатары). Практыка спеваў у сярэднеязычным, грудным і галаўным рэзанатарах. Выкананне песень у манеры Брэсцкага Палесся, Панямоння і іншых этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі.

## 4. Беларуская каляндарна-абрадавая традыцыя

### 4.1 Восеньскія песні

Восеньскія песні ў каляндарна-абрадавым цыкле беларусаў. Жніўныя песні. Функцыянальна-жанравыя групы жніўных песень: зажынкавыя, уласна жніўныя і дажыначныя. Этнафанічныя нормы выканання песень жніва ("галосныя" спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя; тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных выказванняў). Эмацыйнае ўвасабленне меладызму жніўнай абраднасці. Характэрны тэмпарытм, дыяпазон. Свята "Жніво": абрады, рытуалы, звычаі. Семантыка свята "Багач". Народныя прыкметы і павер'і, метэаралагічныяназіранні. Аграрная атрыбутыка свята (калектыўны збор зернавых культур, выраб лубка з зернем і свечкай, абыходы хат, калектыўная вячэра).

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне жніўных песень "А на двары зміркаецца", "Спор жыта, спор", "Кругом яра", "А йшоў Раю", "А ў нашага пана дажыначкі рана". "Ой, наш пан", "Ой дайтэ мне раду", "Жнеечкі". Развучванне і выкананне песень "Ой, наш пан", "Ой дайтэ мне раду". Складанне карты абрадавых дзеянняў жніва.

### 4.2 Зімовыя песні

Віды тыповых зімовых напеваў. Посніцкія і піліпаўскія песні. Рытмаінтанацыйныя асаблівасці калядных песень: рэчытатыўны характар, гучнае, "шумнае" выкананне. Агульныя рысы і адрозненні калядак і шчадровак. Персаніфікаваныя калядкі (гаспадару, гаспадыні, сыну/дачцэ гаспадара). Калядны пост Піліпаўка. Народныя ўяўленні, звязаныя з Піліпаўкай. Асаблівасці харчавання. Апрацоўка льну (попрадкі). Вячоркі-пасядзелкі. Народныя метэаралагічныя назіранні і прыкметы. Беларускія традыцыі святкавання Калядаў. Тры куцці, іх значэнне. Этнафанічная партытура каляднага абраду ў Беларусі. Абрады ваджэння казы, каня, жорава, мядзведзя на поўдні Беларусі. Абрады "Калядныя цары" в.Семежава Копыльскага раёна і "Цягнуць каляду на дуба" в.Новіны Бярэзінскага раёна як нематэрыяльная культурная спадчына Беларусі.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне піліпаўскіх і калядных песень "Піліпаўскія", "Мікольскія", "За кудзеляй", "На супрадках", "Прыйшла Каляда", "Го-го-го, каза", "Хадзіла-блудзіла сем малайцоў", "Калядкі, Калядкі, паелі бліны ды аладкі", "На дуба, калядкі, на дуба дзевачкам кудзелька нялюба", "Ой рана-рана куры попелі", "Добры вечар тому", "Каляда", "Ой, калядкі" (Палессе), "Коліда, молада" (Паазер'е), канты (Паазер'е). Развучванне піліпаўскіх песень "За кудзеляй", "На супрадках". Інсцэніроўка Піліпаўскіх вячорак. Праца над каляднымі песнямі "Прыйшла Каляда", "Го-го-го, каза", "Хадзіла-блудзіла сем малайцоў", "На дуба, калядкі, на дуба дзевачкам кудзелька нялюба", "Ой рана-

рана куры попелі”, “Добры вечар тому”. Прагляд відэаэкскурсіі “Беларускі карнавал: Каляды”. Пастаноўка каляднага абраду “Ваджэнне казы”.

4.3 Песні веснавога цыклу

Прыродныя і астральныя цыклы як аснова веснавой абраднасці. Генезіс, структура, функцыянальныя напрамкі і адметныя асаблівасці беларускіх свят сустрэчы вясны. Этнафанічныя асаблівасці спеваў вясновага перыяду: спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя. Дынамічная напружанасць песенных тэкстаў. Рэгіянальныя асаблівасці этнафанічнай экспрэсіі. Традыцыя святкавання Масленіцы. Адрозненне масленічных напеваў у розных рэгіёнах Беларусі. Абрадавая ежа. Веснавыя гульні, карагоды. Семантыка святкавання “Гуканне вясны” (птушкі з цеста, выкананне вяснянак на пагорках, узвышшах). Абрад “Валачобніцтва”.

Практычныя заняткі.

Развучванне масленічных песень “Масленая, вот я йду”, “На вуліцы Масленіца”, “Масленіца, Масленіца!”. Развучванне вяснянак “Агу, вясна, агу, красна!”, “Вясна на калочку”, “Жаваронаачкі”.

4.4 Песенная традыцыя летняга цыклу

Летнія песні ў каляндарна-абрадавым цыкле беларусаў. Русальныя і троіцкія песні, іх рытмаінтанацыйныя асаблівасці. Семантыка летніх абрадаў “Провады русалкі”, “Ваджэнне куста”, “Троіца”. Свята “Купалле”, паходжанне назвы. Генезіс купальскіх звычаяў і абрадаў, іх агульнаеўрапейскія рысы. Купальскія павер’і, легенды, прыкметы і паданні беларусаў. Сучасныя купальскія традыцыі ў Беларусі. Купальскія гульні. Гульні моладзі каля вогнішча (перакідванне вянкоў, паасобныя і парныя скокі праз касцёр, карагоды-ігрышчы). Гульнявыя элементы ў карнавальным абыходзе вёскі. Спецыфічныя гульнявыя дзеянні купальскіх кірмашоў (спаборніцтвы на вадзе, конныя гульні).

Практычныя заняткі.

Праца над русальнымі песнямі “Ой, бяроза белая”, “На граной нядзеле русалкі сядзелі”, “Правяду русалку”. Прагляд відэаэкскурсіі “Як гучыць Любаншчына”. Рэканструкцыя часткі абраду “Провады русалкі”. Знаёмства з асаблівасцямі купальскага рэпертуару. Развучванне слоў, напеваў, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння купальскіх песень “Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта”, “Ой, рана на Йвана”.

5. Народная харэаграфія

Танцавальны фальклор беларусаў. Віды і жанры народнага танца. Асноўныя пазіцыі рук і ног. Карагодная пластыка. Паняцце “музычная гульня”. Асаблівасці правядзення народных музычных гульняў. Побытавы танец як элемент гульні.

Практычныя заняткі.

Развучванне базавых элементаў беларускай народнай харэаграфіі. Прыпеўкі і харэаграфічныя рухі да побытавых танцаў “Дзева ў сенях стаяла”, “Жораў”, “Як пайшоў казёл”, “А мы проса сеялі”. Знаёмства з народнымі гульнямі “Цяцерка”, “Юрачка”, “Жаніцьба Цярэшкі”. Прагляд правіл гульняў у запісах са святаў і фальклорных экспедыцый. Развучванне слоў, напеваў, рухаў гульняў.

6. Пастаноўчая работа

Практычныя заняткі.

Рэпетыцыйная дзейнасць. Падрыхтоўка да канцэртнай праграмы “Фальклор на ўзроўні душы”. Трэніроўка вакальна-тэхнічных навыкаў, неабходных для перадачы музычнага зместу песні. Разбор і адпрацоўка тэхнічна складаных месцаў. Праца над фразіроўкай, нюансіроўкай, кульмінацыяй твора. Адпрацоўка элементаў двухгалосся. Праца па партыях. Злучэнне партый. Праца над ансамблем, строем, чысцінёй і ўстойлівасцю вакальнай інтанацыі. Злучэнне харэаграфічных рухаў са спевамі. Інструментальнае суправаджэнне абрадавых песень і гульняў.

7. Канцэртная дзейнасць

Практычныя заняткі.

Удзел у канцэртах, фестывалях і конкурсах. Правядзенне канцэртных праграм, майстар-класаў ва ўстановах адукацыі і культуры (ДУА “Рэспубліканская гімназія-каледж пры акадэміі музыкі”, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, бібліятэкі і музеі горада Мінска і інш.).

8. Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць

Знаёмства з фальклорнымі калектывамі (аўтэнтычны фальклорны калектыў “Паваляকі” в. Обчын Любанскага раёна Мінскай вобласці, унесены ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь; Узорны духавы аркестр “Няшота” ДУ “Стаўбцоўскі раённы цэнтр культуры”). Агляд культурных падзей.

Практычныя заняткі.

Наведванне канцэртаў і майстар-класаў. Удзел у перадачах канала “Культура” Беларускага радыё. Наведванне музеяў устаноў адукацыі. Экскурсія ў музей “Беларуская хатка”.

Выніковы занятак

Канцэртная праграма “Фальклор на ўзроўні душы” з запрашэннем бацькоў.

**Матэрыял для працы з навучэнцамі другога года навучання**

Прыкладны песенны рэпертуар

жніўныя песні: “А на двары зміркаецца”, “Спор жыта, спор”,“Кругом яра”, “А йшоў Раю”, “А ў нашага пана дажыначкі рана”. “Ой, наш пан”, “Ой дайтэ мне раду”, “Жнеечкі”;

піліпаўскія песні: “Піліпаўскія”, “Мікольскія”, “За кудзеляй”, “На супрадках”;

калядныя песні: “Прыйшла Каляда”, “Го-го-го, каза”, “Хадзіла-блудзіла сем малайцоў”, “Калядкі, Калядкі, паелі бліны ды аладкі”, “На дуба, калядкі, на дуба дзевачкам кудзелька нялюба”, “Ой рана-рана куры попелі”, “Добры вечар тому”, “Каляда”, “Ой, калядкі” (Палессе), “Коліда, молада!” (Паазер’е), канты (Паазер’е);

масленічныя песні: “Масленая, вот я йду”, “На вуліцы Масленіца”, “Масленіца, Масленіца!”;

вяснянкі: “Агу, вясна, агу, красна!”, “Вясна на калочку”, “Жавароначкі”;

русальныя песні: “Ой, бяроза белая”, “На граной нядзеле дзеўкі сядзелі”, “Правяду русалку”;

купальскія песні: “Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта”, “Ой, рана на Йвана”.

Народныя гульні

“Жаніцьба Цярэшкі”; “Цяцерка”; “Юрачка”.

Побытавыя танцы

“Дзева ў сенях стаяла”;

“Жораў”;

“Як пайшоў казёл”;

“А мы проса сеялі”.

Абрады

“Ваджэнне казы”; “Провады русалкі”.

Відэаматэрыял для працы з навучэнцамі

1. Відэаагляд “Як гучыць Любаншчына” (Дадатак 3).
2. Відэаагляд “Беларускі карнавал: Каляды” (Дадатак 4).
3. Беларускія народныя танцы: этнахарэограф Мікола Козенка.
4. Беларускія народныя песні / Belarusian Folk Songs / Белорусские народные песни.
5. “Праздник урожая «Багач». Как проходил в белорусских деревнях? С какого обряда начинается?” (https://www.youtube.com/watch?v=iWkEmby1ud0&list=PLhpwDaIljMpbzMjfiyL-FLzJupXIaX0Pg&index=20).
6. “Традиции белорусов. Колядки – что это такое и как они проходят?” (https://www.youtube.com/watch?v=vx1mGgAYWYY).
7. “Каляды: как праздновали главный зимний праздник предки современных белорусов” (https://www.youtube.com/watch?v=DrIYUgyp9G4).
8. “Абрад «Гуканне вясны»” (Мінск, Лошыцкі парк) (https://www.youtube.com/watch?v=lrvPUmylfIY).
9. “Купалье: традиции, история и обряды Беларуси” (https://www.youtube.com/watch?v=v4XjjRbvqR8).
10. “Купалье: традиции и обряды || Музей народной архитектуры и быта” (https://www.youtube.com/watch?v=l_yy5QjeEzk).
11. “Купалье – праздник с тысячелетней историей. Фестиваль «Свята Сонца” (https://www.youtube.com/watch?v=xImjfBxHYKk&list=PLhpwDaIljMpbzMjfiyL-FLzJupXIaX0Pg&index=32).

## Чакаемыя вынікі засваення праграмы

Пасля заканчэння другога года навучання навучэнцы павінны

ведаць:

каляндарна-абрадавую і пазаабрадавую музыку;

асноўныя святы беларускага народнага календара, іх традыцыі, рытуалы, абрады;

базавыя элементы беларускай народнай харэаграфіі;

аўтэнтычныя формы народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

умець:

выконваць беларускія народныя каляндарна-абрадавыя песні;

адрозніваць аўтэнтычную манеру выканання ад стылізаванай;

спалучаць спевы з харэаграфічнымі рухамі;

валодаць:

асноўнымі вакальна-тэхнічнымі і вакальна-ансамблевымі навыкамі;

асновамі музычнай і выканальніцкай культуры;

ведамі каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай паэзіі беларусаў.

## Трэці год навучання

Задачы:

знаёміць з народным беларускім касцюмам, з асаблівасцямі элементаў народнага строю розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі;

знаёміць з асноўнымі этапамі фальклорнай экспедыцыі, сродкамі і спосабамі запісу і расшыфроўкі матэрыялаў;

удасканальваць вакальна-ансамблевыя навыкі;

навучаць манеры выканання песень розных этнаграфічных рэгіенаў Беларусі.

### Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзелаў, тэм | Колькасць вучэбных гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго гадзін | у тым ліку | |
| | | | тэарэтычных | практычных |
| | Уводны занятак | 2 | 1 | 1 |
| 1. | Беларуская народная творчаць | 16 | 8 | 8 |
| 1.1 | Беларускі народны касцюм як элемент народнай творчасці | 12 | 6 | 6 |
| 1.2 | Экспедыцыйная дзейнасць | 4 | 2 | 2 |
| 2. | Вакальна-ансамблевая работа | 34 | 8 | 26 |
| 3. | Этнафонія этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі | 108 | 32 | 76 |
| 3.1 | Падзвінне, Паазер’е, Падняпроўе | 32 | 8 | 24 |
| 3.2 | Цэнтральная Беларусь | 24 | 8 | 16 |
| 3.3 | Панямонне | 24 | 8 | 16 |
| 3.4 | Усходняе і Заходняе Палессе | 28 | 8 | 20 |
| 4. | Пастаноўчая работа | 30 | - | 30 |
| 5. | Канцэртная дзейнасць | 14 | - | 14 |
| 6. | Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць | 10 | 1 | 9 |
| | Выніковы занятак | 2 | - | 2 |
| | Усяго | 216 | 50 | 166 |

## Змест праграмы

Уводны занятак

Азнаямленне са зместам праграмы і планам работы ансамбля трэцяга года навучання. Падбор рэпертуару. Правілы бяспечных паводзін на занятках. Актуалізацыя ведаў па пройдзеным матэрыяле.

Практычныя заняткі.

Паўторная дыягностыка навучэнцаў: праверка музычных здольнасцей і галасавых дадзеных пасля летніх канікул. Спевы знаёмых вакальных практыкаванняў.

1. Беларуская народная творчаць

1.1 Беларускі народны касцюм як элемент народнай творчасці

Беларускі народны касцюм і яго роля ў фарміраванні іміджу Беларусі. Гісторыя развіцця беларускага касцюма. Мужчынскі касцюм. Складнікі мужчынскага касцюма (штаны, камізэлькі, нагавіцы, пояс, кашуля і г.д.). Жаночы касцюм. Складнікі жаночага касцюма (спадніца, фартух, кароткая камізэлька, галаўны ўбор (намітка), кашуля і абутак). Тканіны і матэрыялы. Каляровыя асаблівасці аўтэнтычнага беларускага строю. Упрыгожванні. Абутак. Касцюмы рэгіёнаў Беларусі. Элементы беларускага народнага касцюма розных этнаграфічных рэгіёнаў. Сцэнічная адаптацыя і стылізацыя беларускага народнага касцюма.

Практычныя заняткі.

Азнаямленне з фотаальбомам “Беларускі народны касцюм” М.Раманюка, прагляд ілюстрацый. Складанне карты народных строяў.

1.2 Экспедыцыйная дзейнасць

Фальклорныя экспедыцыі як спосаб даследавання народнай спадчыны і сродак захавання нацыянальных традыцый. Асноўныя этапы фальклорнай экспедыцыі. Сродкі і спосабы запісу і расшыфроўкі матэрыялаў.

Практычныя заняткі.

Прагляд відэаматэрыялаў з фальклорных экспедыцый. Расшыфроўка фальклорных матэрыялаў.

2. Вакальна-ансамблевая работа

Тэмбрава-дынамічныя сродкі музычнай выразнасці. Канон. Шматгалоссе. Музычны і тэмбральны слых. Меладычны і гарманічны слых.

Практычныя заняткі.

Праца над пеўчым дыханнем. Артыкуляцыйная гімнастыка. Практыкаванні на развіццё выразнай дыкцыі. Развучванне песень з выразнымі дыялектнымі асаблівасцімі “Ой, дайтэ мне раду”, “На граной нядзеле русалкі сядзелі”, “Росці, каравай”, “Стара галачка” і інш. Практыка спеваў шматгалосся, адпрацоўка навыка вядзення самастойнай вакальнай партыі (“Купайло ночка”, “Перад Пятром”).

3. Этнафонія этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі

3.1 Падзвінне, Паазер’е, Падняпроўе

Асаблівасці манеры выканання песеннага фальклору Падзвіння, Паазер’я і Падняпроўя. Лінгвістычная рэдукцыя ва ўмовах аўтэнтычных спеваў. Вакальнае і інструментальнае ўвасабленне музычнага фальклору. “Траістая музыка” ў

беларускім фальклоры. Музычны склад інструментальнага суправаджэння абрадавых дзей.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне песень Віцебскага Падзвіння. Этнафанічны аналіз абрадавай песні “Ішла Купалка сялом-сялом” (в. Шо Віцебскай вобласці). Развучванне і выкананне песні. Праца з безрэфрэннымі масленічнымі напевамі (паўднёва-цэнтральная частка Беларускага Паазер’я), валачобнымі песнямі “Ішла тучка”, “А ў нядзельку да параненька”. Складанне карты абрадавых дзеянняў святаў. Праслухованне тыповых інструментальных найгрышаў Падзвіння і Падняпроўя.

3.2 Цэнтральная Беларусь

Этнамузычныя асаблівасці каляндарна-абрадавага фальклору рэгіёна. Этнафанічныя нормы выканання песень у Цэнтральнай Беларусі, асаблівасці гукаўтварэння і тэмпарытму. Тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных узораў рэгіёна. Традыцыя жаночых гуртавых спеваў. Скрыжаванне песенных традыцый Клецкага, Слуцкага, Маладзечанскага, Любанскага, Бярэзінскага раёнаў.

Практычныя заняткі.

Праслухоўванне песень Цэнтральнай Беларусі ў выкананні носьбітаў народнай культуры. Праца над пастаноўкай пазіцыі і манеры выканання песень Цэнтральнай Беларусі. Развучванне песень “Ой, у бары сосна” (аг. Морач Клецкага раёна), “На святога Яна” (аг. Морач Клецкага раёна).

3.3 Панямонне

Фанемныя асаблівасці рэгіянальных спеваў Панямоння. Мясцовыя асаблівасці ландшафту і яго ўздзеянне на тып гукавядзення і тэмпарытм (манадыйны характар спеваў; плаўнае, актыўнае гукавядзенне; атака гука). Узаемадзеянне менталітэту, клімату на меладызм песенных традыцый. Асаблівасці музычнага складу інстументальнага суправаджэння на Панямонні (струнныя і шумавыя музычныя інструменты). Вясельныя найгрышы.

Практычныя заняткі.

Праслухованне тыповых інструментальных найгрышаў Панямоння. Развучванне песень “Купала на Йвана”, “Ноч малая ды купальная”, “Іграй, сонца, ды з зарою!”, “То-то!”.

3.4 Усходняе і Заходняе Палессе

Манера выканання народных песень у рэгіёне. Дыялектныя асаблівасці аўтэнтычных спеваў Усходняга і Заходняга Палесся. Актыўнае гукавядзенне ў грудным рэзанатары. Гетэрафонны стыль інтанавання Усходняга Палесся.

Практычныя заняткі.

Азнаямленне з песенным фальклорам Палесся. Этнафанічны аналіз песень. Праслухоўванне тыповых інструментальных найгрышаў Палесся. Практыкаванні на спевы ў манеры Брэсцкага Палесся. Развучванне песень “Пара, маці, жыта жаці”, “Ой, наш пан”.

4. Пастаноўчая работа

Практычныя заняткі.

Рэпетыцыйная дзейнасць. Падрыхтоўка да фальклорнага свята “Карагод традыцый”. Прапяванне песень без музычнага суправаджэння. Разбор і адпрацоўка тэхнічна складаных месцаў. Выкананне песень пад мінусавую фанаграму. Праца над ансамблем, строем, чысцінёй і ўстойлівасцю вакальнай інтанацыі. Інструментальнае суправаджэнне песень. Пастаноўка харэаграфічных рухаў, сцэнічнае ўвасабленне вобразаў песні. Злучэнне харэаграфічных рухаў са спевамі.

5. Канцэртная дзейнасць

Практычныя заняткі.

Удзел у канцэртах, фестывалях і конкурсах. Правядзенне канцэртных праграм, раённых і гарадскіх майстар-класаў ва ўстановах адукацыі і культуры (ДУА “Рэспубліканская гімназія-каледж пры акадэміі музыкі”, Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр юнага гледача, бібліятэкі і музеі горада Мінска, арт-пляцоўкі і інш.).

6. Выхаваўчая работа і сацыяльна значная дзейнасць

Знаёмства з фальклорнымі калектывамі (фальклорныя ансамблі “Верабейкі” і “Напарачка” г.Любань; фальклорны калектыў “Таняжанка” в.Тонеж Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці). Агляд культурных падзей.

Практычныя заняткі.

Наведванне канцэртаў і майстар-класаў. Наведванне Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, абрадаў і святаў на адкрытых пляцоўках. Удзел у перадачах канала “Культура” Беларускага радыё. Наведванне ДУА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, знаёмства са спецыяльнасцямі.

Выніковы занятак

Фальклорнае свята “Карагод традыцый”.

**Матэрыял для працы з навучэнцамі трэцяга года навучання**

Прыкладны песенны рэпертуар

“Ой, дайтэ мне раду”;

“На граной нядзеле русалкі сядзелі”;

“Росці, каравай”;

“Стара галачка”;

“Купайло ночка”;

“Перад Пятром”;

песні Падзвіння, Паазер’я, Падняпроўя: “Ішла Купалка сялом-сялом”, “Ішла тучка”, “А ў нядзельку да параненька”;

песні Цэнтральнай Беларусі: “Ой, у бары сосна”, “На святога Яна”;

песні Панямоння: “Купала на Йвана”, “Ноч малая ды купальная”, “Іграй, сонца, ды з зарою!”, “То-то!”;

песні Палесся: “Пара, маці, жыта жаці”, “Ой, наш пан”.

Відэаматэрыял для працы з навучэнцамі

1. “Белорусские традиции. История возникновения национального костюма” (https://www.youtube.com/watch?v=DRwJrSypw2I).

2. “О настоящей истории белорусского народного костюма” (https://www.youtube.com/watch?v=IPwaq7rorw8).

3. “Белорусский национальный костюм”. Видео в журнале “Рюкзачок” (https://www.youtube.com/watch?v=YSx60PMv7Tg).

4. “Спеўны сход з палескім гуртом “Таняжанка” на “Камяніца – 2018” (https://www.youtube.com/watch?v=V5FDYF2hU1M).

## Чакаемыя вынікі засваення праграмы

Па заканчэнні трэццяга года навучання навучэнцы павінны

ведаць:

фанемныя асаблівасці спеваў розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі;

складнікі традыцыйнага народнага беларускага строя;

асноўныя этапы фальклорнай экспедыцыі;

умець:

праводзіць расшыфроўку і этнафанічны аналіз фальклорнага матэрыялу;

выконваць абрадавыя і пазаабрадавыя песні ў манеры розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі;

выконваць шматгалосныя песенныя ўзоры;

складаць карту абрадавых дзеяў;

валодаць:

функцыянальным зместам рознажанравых песенных твораў;

аўтэнтычнай манерай выканання песень розных этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі;

навыкамі выканальніцкай і сцэнічнай культуры.

## Літаратура і інфармацыйныя рэсурсы

1. Кодекс Республики Беларусь об образовании // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. – 14.01.2022 – №154-З [Электронный ресурс] // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 31.01.2022, 2/2874. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12200154&p1=1&p5=0/. – Дата доступа: 16.02.2024.

2. «О типовых программах дополнительного образования детей и молодёжи» [Электронный ресурс] : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 20.10.2023, №325 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22441011p. – Дата доступа: 16.02.2024.

3. «Об установлении перечня документов, обязательных для ведения отдельными педагогическими работниками, и исключения практики привлечения педагогических работников к выполнению работ, не относящихся к выполнению их трудовых функций» [Электронный ресурс]: постановление

Министерства образования Республики Беларусь, 27.12.2017, №164 // Академия образования. – Режим доступа: https://akademy.by/files/documents/MD-MSOP/Matematika/Perechen_docum.pdf. – Дата доступа: 26.02.2024.

4. «Об утверждении правил безопасности, правил расследования и учета несчастных случаев, произошедших с обучающимися» [Электронный ресурс] : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 03.08.2022, № 227 // Национальный образовательный портал. – Режим доступа: https://adu.by/images/2022/09/post-MO-RB-227-2022.pdf. – Дата доступа: 26.02.2024.

5. Образцы оформления библиографического описания в списке источников, приводимых в диссертации и автореферате [Электронный ресурс] : приказ Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь, 25.06.2014, № 159 (в ред. приказа Высшей аттестационной комиссии Республики Беларусь от 08.09.2016 № 206) // Высшая аттестационная комиссия Республики Беларусь. – Режим доступа: https://vak.g ov.by/bibliographicDescription. – Дата доступа: 23.02.2024.

6. Положение об учреждении дополнительного образования детей и молодежи [Электронный ресурс] : постановление Министерства образования Республики Беларусь, 25.07.2011, № 149 (в ред. постановления Министерства образования Республики Беларусь от 19.09.2022 № 318) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W22238827&p1=1&p5=0. – Дата доступа: 22.02.2024.

7. «Специфические санитарно-эпидемиологические требования к содержанию и эксплуатации учреждений образования» [Электронный ресурс] : постановление Совета Министров Республики Беларусь, 07.08.2019, № 525 (в ред. постановлений Совмина от 17.01.2022 № 29, от 31.08.2022 № 570, от 15.11.2022 № 780) // Министерство образования Республики Беларусь. – Режим доступа: https://edu.gov.by/sistema-obrazovaniya/glavnoe-upravlenie-obshchego-srednego-doshkolnogo-i-spetsialnogo-obrazovaniya/srenee-obr/sanitarnye-normy-pravila-i-gigienicheskie-normativy. – Дата доступа: 22.02.2024.

8. Методические указания по разработке учебно-программной документации образовательной программы дополнительного образования детей и молодежи и организации образовательного процесса [Электронный ресурс] : приложение к письму Министерства образования Республики Беларусь 11.06.2024 № 06-01-14/6880/дс/ // Министерство образования Республики Беларусь. – Режим доступа: https://edu.gov.by/molodezhnaya-politika/glavnoe-upravlenie-vospitatelnoy-raboty-i-molodezhnoy-politiki/upravlenie-raboty/informatsiya/molodezhi/dopolnitelnoe-obrazovanie-dlya-detey-i-molodezhi/. – Дата доступа: 26.06.2024.

9. Волков, Г. Н. Этнопедагогика : Учеб. для студ. сред. и высш. пед. учеб. заведений / Г. Н. Волков – М. : Академия, 1999. – 168 с.

10. Вясна на Беларусі : Рэпертуарны зборнік. – Мінск : НЦТДіМ, 1998.

11. Гульні, забавы, ігрышчы / Уклад. А. Лозка. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 534 с.

12. Дзіцячы фальклор / Уклад. Г. А. Барташэвіч, уклад. муз. часткі В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.
13. Кукушкин, В. С. Этнопедагогика и этнопсихология / В. С. Кукушкин, Л. Д. Столяренко. – Ростов н / Д. : Феникс, 2000. – 448 с.
14. Курыловіч, Г. М. Этнаграфія дзяцінства // Этнаграфія Беларусі : Энцыклапедыя / Рэдкал. І. Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 546 с.
15. Мядоцкі край і яго таленты : Даведнік фестывалю (30 мая – 1 чэрвеня 1997 г., в. Мётча) / Укл. М. Козенка. – Мінск : ВЛАДИ-АРТ, 1997. – 109 с.
16. Науменко, Г. М. Фольклорная азбука : Учебное пособие для начальной школы / Г. М. Науменко. – М. : Издательский центр “Академия”, 1996. – 136 с.
17. Ракава, Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск :Ураджай, 2000. – 111 с.
18. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк., 2001-2013. – Т. 1 : Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева [і інш.].– 2001. – 797 с.
19. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк., 2001-2013. – Т. 2 : Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева [і інш.].– 2004. – 910 с.
20. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2006. – 608 с.
21. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – 2006. – 736 с.
22. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе: у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2008. – 559 с.
23. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – 2009. – 863 с.
24. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь: у 2 кн., кн. 1 / В. І. Басько [і інш.]. – 2010. – 847 с.
25. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – 2011. – 911 с.
26. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе: у 2 кн., кн. 1 / Т. В. Валідзіна [і інш.]. – 2012. – 910 с.
27. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Бел. Навука, Выш. шк, 2001-2013. – Т. 6 : Гомельскае Палессе і Падняпроўе : у 2 кн., кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]. – 2013. – 1231 с.

28. Фонахрэстаматыя па беларускай народнай музыцы : у 8 дысках / ІМЭФ АН РБ ; склад. З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева, Т. А. Канстанцінава. – Мінск, 2007.

Літаратура для навучэнцаў

1. Бандарчык, В. К. Грамадскі быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В. К. Бандарчык, Л. І. Мінько, Г. І. Каспяровіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 256 с. : іл.

2. Беларускія народныя гульні і забавы / уклад. К. Л. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 1996. – 31 с.

3. Беларускія народныя танцы, карагоды і гульні / уклад. В. С. Семенякоў. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 125 с

4. Гурскі, А. І. Святкаванне Каляд у Беларусі / А. І. Гурскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1998. – 168 с.

5. Дзіцячы фальклор : зборнік фальклорных матэрыялаў / рэдкал.: У. А. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : БДПУ, 2006. – 359 с.

6. Жаніцьба Цярэшкі / уклад. Л. М.Салавей і І. Дз. Назінай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 564 с.

Інфармацыйныя рэсурсы

1. Государственное учреждение «Историко-культурный музей-заповедник „Заславль“» [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://zaslaue.museum.by/node/53389. – Дата доступа 10.05.2024.

2. Студэнцкае этнаграфічнае таварыства [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://set.ethno.by/. – Дата доступа 10.05.2024.

3. Цмок, Зюзя и другие герои белорусской мифологии [Электронный ресурс] // Про Беларусь. – Режим доступа: https://probelarus.by/blog/tsmok-zyuzya-i-drugie-geroi-belorusskoj-mifologii.html. – Дата доступа 10.05.2024.

4. ЭТНАЎСЁ – анлайн-база публікацый па этнаграфіі Беларусі [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ethnoby.org/. – Дата доступа 10.05.2024.

***Дадатак 1***

## Этнафанічны аналіз абрадавых песень

| **Фальклорны тэкст** | **Этнафанічная транскрыпцыя** |
|---|---|
| | Музычны склад – аднагалоссе<br>Стыль інтанавання –гетэрафонія<br>Дыяпазон – ад до да сі першай актавы<br>Рэгістры фанацыі→памежжа ніжняга і сярэдняга рэгістра<br>Рэзанатары – грудная клетка – рота-глотка<br>Рэзанатарныя вузлы - грудная клетка -падбародак – цвёрдае паднябенне<br>Тып інтанавання –вакальны → характар голасавядзення –плаўны, фрагментарна штуршковы<br>Пеўчая пазіцыя – сярэднеязычная<br>Артыкуляцыйная устаноўка – О |
| Го-го-го, каза!<br>Го-го-го, шэра!<br>Дзе ж ты, козанька, дзе ж ты бывала?<br>- Я ў бару, бару, ягадкі брала.<br>Я ў бару, бару, ягадкі брала,<br>Як прабег ваўчок, схапіў козаньку,<br>А ваўчанята за казянята.<br>Го-го-го, каза!<br>Го-го-го, шэра!<br>Як ты козанька, як ты крычала?<br>- Так я крычала: Ме-ге-ге-ге-ге!..<br>Як ты козанька, як ты ўцякала?<br>- Так я ўцякала: Тупы-тупы-тупы-туп!.. | Го-го-го, каза!<br>Го-го-го, шэра!<br>Дзе ж т**Э,** козанька, дзе ж т**Э** бывала?<br>- Я ў бар**О**, бар**О**, ягадкі брала.<br>Я ў барО, барО, ягадкі брала,<br>Як прабег ваўчок, схапЕў козаньку,<br>А ваўчанята за казянята.<br>Го-го-го, каза!<br>Го-го-го, шэра!<br>Як т**Э** козанька, як ты крычала?<br>- Так я кр**Э**чала: Ме-ге-ге-ге-ге!..<br>Як ты козанька, як ты ўцякала?<br>- Так я ўцякала: Т**О**пы-т**О**пы-т**О**пы-т**О**п!.. |

*Дадатак 2*

## Карта абрадавых дзеянняў (на прыкладзе абраду “Каляды”)

| **Акцыянальны код** (*ход абрадавых падзей*) | **Тэмпаральны код** (*час адпраўлення абрадавых падзей*) | **Лакатыўны код** (*месца адпраўлення абрадавых падзей*) | **Персанальны код** (*кола ўдзельнікаў, персанажы абрадавых падзей*) | **Атрыбутыўны код** (*абрадавая атрыбутыка і прылады ў абрадавых падзеях*) | **Музычна-вербальны код** (*песеннае і вербальнае суправаджэнне абрадавых падзей*) | **Музычна-інструментальны код** (*інструментальнае суправаджэнне абрадавых падзей*) | **Пластычны код** (*пластычнае ўвасабленне і харэаграфічнае суправаджэнне абрадавых падзей*) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. Посная (“галодная”) куцця. Вячэра ў гонар продкаў | Перад нараджэннем Хрыстовым. Для каталікаў – 24 снежня, праваслаўных – 6 студзеня | Хата гаспадара | Усе члены сям’і | Куцця, посныя стравы: рыба, саладуха, талакно, сена | 1) За вячэрай сакральнае маўчанне;<br>2) Закліканне мароза на куццю: “Мароз, мароз, хадзі куццю есці, не марозь малых цялятак, парасятак, гарод…”. | Не было | Седзячы за сталом |
| 2. Варожбы | На куццю (пасля вячэры) | Вуліца, хата, пад вокнамі іншых хат | Дзяўчаты | Люстэрка, боты, паленцы, бліны | Не было | Не было | Не было |
| 3. Святочная служба | Наступны дзень пасля куцці | Царква | Святар | Царкоўныя прылады | Канты | Трапар, кандак, свята, песні духоўнага зместу | Статычна |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4. Калядныя абходы | Першы дзень Каляд (вечарам) | Вуліца, пад вокнамі, у хаце | I. Гурт калядоўшчыкаў:<br>1) калядоўшчыкі (змешаны гурт);<br>2) маскіраваныя персанажы: “мядзведзь”, “воўк”, “жораў”, “каза”;<br>3) зорканосец.<br>II. Гурт Хрыстаславаў | Зорка, мех | 1) Калядкі агульнага зместу пра надыход свята, вандраванне Каляды;<br>2) Дэферынцы-раваныя калядкі (услаўленне гаспадару, дачцэ, сыну);<br>3) “Слава Хрысту”, трапар, кандак, песні духоўнага зместу. | Скрыпка, званочкі, гармонік, трашчоткі | Статычна. Гульня “Каза” (в. Вярэчча) |
| 5. Калядныя ігрышчы, гульні, забавы. “Жаніцьба Цярэшкі” | На працягу Каляд | Карчма | Нежанатая моладзь, “бацька”, “матка” | Шапка, стравы святочныя | Прыпеўкі да “Лявоніхі”, песні пры падборы пар, песні-цярэшкі, песні дзяўчыны-“бабулькі” | Гармонік, скрыпка, дуда | 1) Танец “Лявоніха”;<br>2) Скручванне пар;<br>3) Уцёкі “бабулі” ад “дзядулі”;<br>4) Побытавыя танцы: “Кракавяк”, “Падэспань”. |
| 6. Калядная бяседа | Пасля калядавання, ігрышчаў | Хата | Калядоўшчыкі (дзеці, моладзь, дарослыя) | Пачастункі гаспадароў | Калядкі агульнага зместу пра надыход свята, вандраванне | Скрыпка, званочкі, гармонік, трашчоткі | Побытавыя танцы: “Кракавяк”, “Падэспань” |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | Каляды, вершы духоўнага зместу | | |
| 7. Багатая (“тоўстая”) куцця | Напярэдадні Новага года | Хата гаспадара | Усе члены сям’і | Кілбаскі, сала, піражкі, мяса, бліны, масла, халадзец | Не было | Не было | Седзячы за сталом |
| 8. Апісванне Каляд. Вадохрышчан-ская куцця (трэцяя) | На Вадохрышчан-скую куццю | Хата гаспадара (на вокнах і дзвярах) | Гаспадары хат | Святая вада, крыжы, кусочак тканіны на крыж (фартушок) | Канты, псалмы “Во Іордані крэшчаюць Цібе, Госпадзі” | Не было | Статычна |
| 9. Асвяшчэнне вады (Вадохрышча) | На Вадохрышча | Хата, вуліца, каля возера | | Святая вада, крыж | Канты, псалмы “Во Іордані крэшчаюць Цібе, Госпадзі” | Не было | Статычна |

*Дадатак 3*

**Відэаагляд “Як гучыць Любаншчына”**

https://disk.yandex.ru/d/ZY3DAdrEwrD1Fg

Метадычныя рэкамендацыі да відэаагляду “Як гучыць Любаншчына”

https://umk.mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/140/73583/doc/ЦДОДиМ%20Маяк%20Мордань%20Д.А.%20Виртуальная%20экскурсия.pdf

*Дадатак 4*

**Відэаагляд “Беларускі карнавал: Каляды”**

https://drive.google.com/file/d/16whYZ-ihiMn7uJzXdzS4mo_KtW0P_oay/view

Метадычныя рэкамендацыі да відэаагляду “Беларускі карнавал: Каляды”

https://umk.mayak.minskedu.gov.by/files/01581/obj/140/76093/doc/Мордань%20Д.%20А.%20Каляды.pdf

***Дадатак 5***

## Дыягностыка музычных здольнасцей

***П*** *– пачатак навучальнага года*
***К*** *– канец навучальнага года*

| **Крытэрыі ацэнкі** | Успрыманне музычнага фальклору | | Народныя спевы | | Музычна-рытмічныя рухі | | Ігра на музычных інструментах | | Манера выканання, атака гуку | | Музычна-гульнявая творчасць | | Узровень музычнага развіцця | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Прозвішча, імя навучэнца** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** | ***п*** | ***к*** |
| | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | | | | | | |

***Дадатак 6***

## Крытэрыі ацэнкі выканання музычнага твора ў аўтэнтычнай манеры

1. Адпаведнасць манеры выканання музычнага твора этнаграфічнаму рэгіёну (тэмбральныя асаблівасці).
2. Адлюстраванне дыялектных асаблівасцей этнаграфічнага рэгіёну.
3. Пачуццё тэмпарытму, чыстае інтанаванне.
4. Эмацыйнае адлюстраванне драматургіі абрадавага фальклору.
5. Адпаведнасць мастацкага вобразу выканаўцы.

РЭКАМЕНДАВАНА
на пасяджэнні метадычнага савета
пратакол № ______
ад “___ __” _____________ 2024 г.

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення па адукацыі
адміністрацыі Ленінскага раёна г.Мінска
______________Н.Г.Кучынская
“___ __” _____________ 2024 г.